# АНАТОЛЬ КАНАПЕЛЬКА: ЖЫЦЦЁ ПРАДОЎЖЫЦЦА Ў ПЕСНІ

***Дапаможнік***

Репозиторий ВГУ

*2010*

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Бел)6-5
К19

.

Складальнікі: загадчык кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **В.І. Русілка**; **С.І. Федаровіч** (Канапелька); старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **І.В. Саматой**

Р э ц э н з е н т:
прарэктар па вучэбнай рабоце ДУА “Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Ю.У. Маханькоў*

Репозиторий ВГУ

У дадзенае выданне ўвайшлі выбраныя вершы і пераклады на беларускую мову А. Канапелькі, былога дацэнта кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”.

Адрасуецца студэнтам філалагічных спецыяльнасцей, настаўнікам і аматарам беларускай літаратуры.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Бел)6-5**

© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2010

# “ЧАЛАВЕК НАРАДЖАЕЦЦА ЗОРКАЮ…”

Сярод творчых індывідуальнасцей пасляваеннага, так званага філалагічнага пакалення, якое прыйшло ў літаратуру ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, сваёй адметнасцю і непаўторнасцю вылучаецца постаць віцебскага паэта, былога дацэнта кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча (пасмяротна), выдатніка Рэспублікі Беларусь, паэта, які, на жаль, рана і нечакана пайшоў з жыцця, Анатоля Мікалаевіча Канапелькі.

Характар творчасці пісьменніка, як вядома, абумоўліваецца яго біяграфіяй. Нарадзіўся Анатоль Канапелька 16 лістапада 1939 года ў мястэчку Расоны Віцебскай вобласці ў сям’і служачага. З першых дзён вайны бацькі знаходзіліся ў партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці.

Пасля вайны вучыўся ў СШ № 7 г. Полацка, а ў 1956 г. стаў студэнтам філалагічнага факультэта Полацкага педагагічнага інстытута, пазней факультэт перавялі ў Магілёўскі педагагічны інстытут, які А. Канапелька скончыў у 1961 г. З 1961 года займаўся педагагічнай працай.

Вершы пачаў пісаць яшчэ школьнікам. У друку яны ўпершыню з’явіліся ў 1955 годзе – у полацкай газеце “Сцяг камунізму”. Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў “Дзвіна” (1958), “Калинові мост” (1969), “Беларускі каляндар” (1970), “Матчына слова” (1991), “Анталогія беларускай паэзіі”, Т. 3 (1993 г.). Аўтар зборнікаў вершаў “Зямная сімфонія” (1966), “Сустрэчы” (1979), “Музыка лістапада” (1999), а таксама шэрагу навуковых прац і артыкулаў пра Яна Баршчэўскага, Максіма Гарэцкага, Петруся Броўку, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна. Пераклаў на беларускую мову вершы рускіх паэтаў А. Пушкіна, М. Рыленкава, А. Мішына, У. Прастакова, з польскай мовы – балады і вершы Я. Баршчэўскага, Т. Лады-Заблоцкага, з цыганскай – В. Калініна.

Репозиторий ВГУ

Анатоля Мікалаевіча, без перабольшання, ведала ўся гуманітарная, філалагічная Віцебшчына: нездарма ж адпрацаваў на педагагічнай ніве больш як сорак гадоў. На працягу доўгага часу ён кіраваў студэнцкім літаратурным аб'яднаннем "Заранічка", члены якога выступаюць у друку, а некаторыя ўжо выпусцілі свае кнігі.

Ранняя паэзія Анатоля Канапелькі ў асноўным мажорная па сваім настроі: адчуваецца бадзёрасць, захапленне навакольным светам, радасцю жыцця, усведамленнем сваёй значнасці ў свеце. Вершы яго лірычныя, прачулыя, душэўныя, асабліва, калі гаворка ідзе пра край бацькоў, хараство і веліч прыроды, шчодрасць чалавечай душы, загадкі і таямніцы кахання. Лірыка апошніх гадоў мае філасофскае гучанне. У ёй – роздум пра сэнс жыцця чалавека, уласную творчасць, лёс роднай мовы, гістарычныя і культурныя каштоўнасці Бацькаўшчыны.

Яснасць і прастата паэтычнай вобразнасці, выразнасць бачання, псіхалагізм – якасці, уласцівыя выбраным вершам і перакладам, якія ўвайшлі ў новую кнігу А. Канапелькі.

"Чалавек нараджаецца зоркаю…" – гэта радкі з верша Анатоля Мікалаевіча Канапелькі, які нарадзіўся, жыў, дарыў сваё чароўнае святло паэзіі і душы людзям, застаўся ў памяці адной з найбольш яскравых зорак на небасхіле паэтычнай Віцебшчыны. 18 снежня 2002 года памёр Анатоль Канапелька. Пахаваны ў Віцебску.

Выданне дапаможніка "Жыццё прадоўжыцца ў песні" прысвечана 100-годдзю УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", будзе спрыяць патрыятычнаму і эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, можа быць выкарыстана на занятках па сучаснай літаратуры Беларусі, тэорыі літаратуры. Кніга будзе цікавай і карыснай не толькі студэнтам, але і вучням, настаўнікам, у працэсе выкладання беларускай літаратуры.

***І.В. Саматой***

Репозиторий ВГУ

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ ЛІРЫКА

*“Магчыма тым і ганаруся*
*што з нашай глебы*
*прарасло*
*і сонца вечнай Беларусі,*
*і мовы*
*вечнае святло!”*

У грамадзянскай лірыцы А. Канапелькі выказваюцца думкі, пачуцці, звязаныя з жыццём беларускага народа. У вершах гучыць пачуццё бязмежнай любові да мінулага і сучаснага Радзімы, духоўнай спадчыны, роднай мовы і культуры. Аўтар выказвае сваё разуменне падзей і з’яў, ацэньвае іх з пазіцыі паэта-патрыёта. Вершы гучаць то велічна, узнёсла, радасна, то ціха, кранаюча-пранікнёна, як малітва, як прызнанне ў любові да свайго краю і маюць эстэтычную каштоўнасць і вялікае выхаваўчае значэнне.

*** * ***

Мы нарадзіліся такія,
Такія будзем да канца:
Нястомныя і трапяткія,
З нязломнай воляю байца.
Не глухлі мы ў громе бою.
(Бацькам нялёгкі выпаў лёс).
Мы нарадзіліся з табою
Сярод параненых бяроз.
Глядзі і помні, мой равеснік,
Былі бярозы у бінтах,
А мы пад чыстым небам веснім
Барозен чорных чулі пах.
Нам любы даль цяжкіх вандровак,
Барвовых лісцяў аганькі,
Ў пакутах знойдзенае слова
І поціск ласкавай рукі!

РЭХА

Адгукніся, рэха, адгукніся,
Адгукніся і назад вярніся.
Не блукай пад шапкай-невідзімкай,
Адгукніся і хутчэй хадзі к нам.



Репозиторий ВГУ

Не палохай хвоі векавыя,
Не палохай сцежкі баравыя.
Не палохай цішыню лясную,
Не палохай восень трапяткую.
Адгукніся, рэха, адгукніся,
Над зямлёю, рэха, узніміся!
Загукаю – заспявае вецер,
Загукаю – заіскрыцца вецце,
Загукаю – лістапад закружыць,
Загукаю – усміхнецца дружа.
Загукаю, моцна загукаю –
Сваё сэрца
людзям
адмыкаю!

* * *

Я веру ў тое, што люблю,
я веру ў тое, што кахаю,
у сваю пакутную зямлю,
з якой усе мы ўзрастаем.
Яна не здрадзіць,
не прадасць,
плыве ў сусвеце сціплай
знічкай,
калі патрэбна –
сілы дасць,
а трэба –
да сябе
пакліча.

## РАДЗІМЕ

Тваёй вялікай праўдаю жыву,
з таёй сяўні я рассыпаю росы
на золкую дрыготкую траву,
у цёплыя барозны.

Тваім дыханнем перапоўнен я,
тваім сумленнем матчыным асветлен,
і слухаю, як поўніцца зямля
настоем працы –
жытнім ветрам.



Репозиторий ВГУ

## БЕЛАРУСІ

Я прыходжу беззваротна
ў край крынічны і азёрны,
ў край арэхавы і зорны,
ў край,
          дзе кожны спіць
                                        чацвёрты
на апошняй, на Айчыннай,
дзе глядзяцца абеліскі
у блакітны
іх вачыма.
… Я прыходжу беззваротна:
без цябе мне –
                    немагчыма.

* * *

Я параўнаю з дзівасілам
зямлю,
          што дадзена мне ў спадчыну,
дзе па вясне
          дужэюць крылы,
вяртае вырай
          мова матчына.
Магчыма
          тым і ганаруся,
што з нашай глебы
прарасло
і сонца
          вечнай Беларусі,
і мовы
          вечнае святло!

* * *

У красе красавіцкай,
у блакіце лясным
я магу растварыцца
у Храме Вечнай Вясны.
Невыказнае дзіва!
мой магутнейшы Бог
падарыў мне Радзіму,
што ў стагоддзях збярог.

Репозиторий ВГУ

*** 

Я – крывіч. Ты – мая крывічанка.
У нашых вачах
неба азёрнага краю
і блакітаў наддзвінскіх душа.
Я – крывіч. Ты – мая крывічанка.
Мы з табою часцінкі
адзінага спарыша.

*** 

*Уладзіміру Папковічу*

Зусім нечакана верасы расцвілі
і ў росным блакіце аблокі гайдаюць.
Добрыя песні на добрай зямлі
добрыя людзі спяваюць.

Прыгожыя словы крынічна гучаць
на мове крывіцкай радзімай.
З жыццёвых дарог будуць нас прывячаць
журботныя вочы Радзімы.

*** 

Плача над берагам чаіца,
вецер журботна пяе.
Той, хто радзімы цураецца,
страціць навечна яе.

Слова на боль адгукаецца,
воблачкам светлым плыве.
… Плача над берагам чаіца
і за сабою заве.

*** 

*Тодару Кляшторнаму*

Ён сейбіт быў, садоўнік адмысловы,
любіў вясну і восеньскі прастор.
Ён звязваў у вязьмо святыя словы
і песні слухаў нерушовых зор.

Репозиторий ВГУ

Святло душы вясёлкаю прыгожай
над Беларуссю роднаю плыло,
а сэрца адгукнулася трывожна
на тое, што ў свядомасці жыло.

На боль людскі, закратаваны ў краты,
на тое, што манкурты ажылі…

І павялі Паэта ў Курапаты –
і васількі ў Парэччы адцвілі.

* * *

Я слова роднае лаўлю.
Яно святое цудадзейства.
Яно мудрэйшае ўмельства
сказаць пра тое, што люблю.

Яно спявае, як прамень,
які зямлю злучае з сонцам.
Яно бывае абаронцам
у цяжкі для Радзімы дзень.

Я з ім смуткую і смяюся,
страчаю восень і вясну.
Яно, як горыч Беларусі,
якой сягоння не да сну.

### РОДНАЕ СЛОВА

Адкрываю,
як свет,
нанова
беларускае
роднае слова,
пералівістае,
як каменчык,
вясёлкавае,
як ручэй,
цёплае,
як агенчык
добрых тваіх вачэй,

Репозиторий ВГУ

светлае,
як маланка,
гнеўнае,
як пярун,
ціхае,
як калыханка,
вечнае,
як Беларусь!

## МОВА

Я не здзівіўся, што такую мову
Я змог адразу сэрцам зразумець.
Я прагна слухаў трапяткое слова
І навучыўся размаўляць і пець.
І я шчаслівы,
Што жыву з табою,
Што ты са мною, мудрая, ідзеш.
Ты часам плачаш ад людскога болю,
Смяешся ты ад радасці людзей!

## РАСОНШЧЫНА – РАДЗІННАЯ РАДЗІМА

Прыгожая ў зялёным шматгалоссі,
прыгожая, калі вятры прыносяць
на Дрысу арабінавую восень.

Прыгожая ў зіхоткім шалясценні
святла і ценяў,
мройных летуценняў.
Прыгожая, калі ідуць снягі,
у комінах нячысцікі схаваны…

Прастуеш на Каляды ў Мурагі
паслухаць байкі шляхціца Завальні.

* * *

Дняпроўскі край –
Зямля суровых продкаў,
Зямля вячыстых бронзавых бароў,

Репозиторий ВГУ

Зямля маіх шчаслівых аднагодкаў,
Зямля маіх няўрымлівых сяброў.
Дняпроўскі край –
Зямля людской любові,
Зямля, дзе родным здасца кожны гук,
Зямля пявучай беларускай мовы,
Зямля пяшчотных працавітых рук.
Дняпроўскі край –
Зямля легенд і казак,
Зямля, дзе людзі ў дружбе хочуць жыць,
Зямля, з якой ад нараджэння звязан,
Зямля, якою трэба даражыць!

## КРУГЛАЕ

Сустрэчаю расчулены,
я прыспяшаю крок:
ля самай Друці
Круглае –
глыбінны гарадок.
Няблізка, недалёка,
але заўжды відно,
як снежныя аблокі
плывуць з Талачыно.
Плывуць па юркай Друці
ля жоўтай асакі…
І ноччу не заснуць тут
на беразе ракі.
Барвовы вецер круціць
бярозавы вянок…
Жыве
          на плыткай Друці
раённы гарадок!

## КРЫНКІ

*Давіду Сімановічу*

Невялічкая станцыя Крынкі –
песенны вугалок.
Тут крынічны халадок
І крынчанкі – як вярбінкі.



Репозиторий ВГУ

Прыгажосці перабор:
сонца карануе Крынкі,
Раніцою росы – льдзінкі
і падсінены прастор.

Салаўіны хмельны кут
і няўтольны вецер.
І прывецяць госця тут
як нідзе на свеце.

А твойго юнацтва ўзлёт
і твае блакіты
вось ужо каторы год
імі не забыты.

## ВЫСАЧАНЫ

*“Тут жывая крыніца”. –*
*надпіс на крынічным зрубе*
*ў в. Высачаны Лёзненскага раёна*

Жывой вадой не наталіцца:
зямны струмень – жыццю вянец.
І напаўняецца карэц
нястомнай бліскавіцай.

Пад сонцам я – праменны Бог!
І не магу я наталіцца.
Бруіцца чыстая крыніца
на ростанях крутых дарог.

Высокі поўдзень – звон крыніц.
Высокі поўдзень – даль ірдзее.
Вада жывая – як надзея,
якую мне
не наталіць!

* * *

*З народнага*

Наша вёска невялічка:
хаты ў ёй на пераклік,
срэбразвонная крынічка
і ружовы маладзік.



Репозиторий ВГУ

Пахне вечар дурнап’янам.
А гарэза салавей
на ўсю ночку закаханых
за аселіцу заве.
Пералескі і ўзгоркі.
Цішыня. Начны пакой.
Скора вёска крыкне: “Горка!..”
жаніху і маладой.

## СПЕЎНЫ ДЗЕНЬ

Спеўны дзень – заўсёды свята:
гукі яркі ткуць сувой.
Я жыву, як птах крылаты,
ветрам, сонцам, сінявой.

Я спяваю – не журуся.
Шлях мой дальні з бліскавіц.
Спеўны дзень – святло крыніц
і блакіты Белай Русі.

* * *

Чалавечая Памяць –
незабыўная рана,
як вячыстае Поле,
вайной узаранае,
дзе нічога жывога
не застаецца,
толькі рубцы
на ЗЯМЛІ і на СЭРЦЫ.

## ПАМЯЦЬ

Нам
не забыць
ваенныя гады,
цяжар нечалавечы на плячах,
як чорным крумкачом
кружыўся
чорны дым
і сонца чорнае
канала
ў вачах.



Репозиторий ВГУ

## ФРАНТАВЫЯ ДАРОГІ

Святыя дарогі да Перамогі,
святыя дарогі!..
Палітыя потам салдацкім, крывёю
і слаўныя вечнай легендай жывою.
Вы столькі пранеслі і зведалі столькі:
і полымя бітваў, пажараў дым горкі,
і ростані горыч, і радасць сустрэчы,
і невыносны боль чалавечы!..
Святыя дарогі
да Перамогі.

* * *

Колькі блізкіх
                    і родных імён
на зямлі не далічана…
Іх чакаюць,
                    забыўшы пра сон,
у Полацку,
                    Брэсце,
                              у Клічаве…
Так доўга чакаюць іх,
дарагіх,
                    незабыўных,
                              каханых.
Іх чакаюць,
                    вайной адабраных,
маладых і старых –
                    жывых!
Маткі слепнуць
                    ад горкіх слёз,
і сівеюць удовы ад болю,
абеліскі –
                    пад ценем бяроз,
абеліскі –
пад ценем таполяў…

Репозиторий ВГУ

## У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

I

Святая цішыня…
І раптам гром,
Страшэнны выбух аглушыў мяне.
"Бывай, Радзіма!" –
выбіта штыком
На ссечанай асколкамі сцяне.
Як утрапёны, стогне Мухавец,
І Буг,
ад бомб успенены,
дыміцца.
З апошняю гранатаю баец
Застыў,
непакароны,
у граніце!
А крэпасць, нібы пекла, у агні,
І казематы дыхаюць бяссмерцем.
…Тут не чуваць музейнай цішыні,
Тут і дыханне
выбухам
здаецца!

II

Ноч апусцілася на бастыёны славы,
І спіць зямля,
стаміўшыся за дзень.
Каменні шэпчуць маладой атаве
Легенды пра няскораных людзей.
А недзе побач, ля руінаў блізка,
Бушуе ў росах салаўіны бэз.
Здаецца поўня
кулямётным дыскам, –
Ды спіць спакойна
прыгранічны Брэст.

* * *

Не хопіць дыхання,
каб вымавіць слова.
Хвіліна маўлення –
схіляем галовы.



Репозиторий ВГУ

Хвіліна жалобы
і шанавання,
хвіліна маўчання,
хвіліна маўчання!..

Не трэба адчаю,
не трэба журыцца…
Хвіліна маўлення –
як міг бліскавіцы.

* * *

Я жыву на плошчы Перамогі.
Тры штыкі вартаюць цішыню:
тут перакрыжованы дарогі
трох франтоў ля Вечнага агню.

Тут сурова, велічна і строга,
горычы трывожная струна:
тут адна навечна Перамога
і навечна Памяць тут адна!

* * *

Я чую, як зямля вібрыруе
ад важкіх МАЗаў і турбін,
ад граю птушак, што ляцяць у вырai,
ад гронак спелых арабін,
ад лісцяў дрогкіх, ад праменняў сонца,
ад моцных рук таварышаў маіх,
ад песень, што спяваюць сосны,
і ад дыхання паўшых і жывых.

## ВУЛІЦА БАЦЬКІ МІНАЯ

Ліпы, таполі мінаю.
Крочу шумлівай ліствой.
Вуліца бацькі Міная
выткана сінявой.
Птушкі над ёю лунаюць.
Шапоча зялёны прасцяг.
Вуліца бацькі Міная –



Репозиторий ВГУ

жыцця няўміручы працяг.
Са мною трывога зямная.
І чуецца грукат баёў…
Вуліца бацькі Міная
праходзіць праз сэрца маё.

## НА СМАЛЕНСКАЙ ДАРОЗЕ

У сэрца б'е трывога:
узнікае спакваля –
Смаленская дарога,
руская зямля.

Амаль на кожнай выспе
бярозы ўжо гараць,
застылі абеліскі –
салдаты спяць.

І чырванеюць зоркі
на брацкіх курганах.
Туман,
ад дыму горкі,
махоркаю прапах.

І дыхаць нават цяжка –
прагорклая жарства.
Нібы пасля зацяжкі –
кругамі галава.

А ў сэрца б'е трывога.
І сцелецца здаля
Смаленская дарога,
руская зямля.

* * *

*Аляксею Мішыну*

Аўтобус дрогкі
ды не бяда!..
І вось за горкаю –
Слабада.



Репозиторий ВГУ

Сапшо направа.
Налева сосны.
А наш напрамак
насустрач сонцу!

Матор гудзе.
Шаша калыша.
Смяецца дзень,
як Лёша Мішын.

Прыпеўкі сыпле,
быццам з меху.
Адкуль бярэ ён
столькі смеху?

А ў сэрцы песня,
як шторм, клякоча.
Адкуль бяруцца
такія вочы?..

І столькі ў іх
дабрыні і сіні
з чыстых,
бруістых
крыніц Расіі!..

* * *

Аблокі цёплыя плылі
ў блакіце плыткае Нэрлі.
І шалясцеў стракаты свет,
высока – рэактыўны след.
Праменна музыка гучала
ў зіхценні старадаўніх ліп.
І так трывожна, так адчайна
званы набатныя гулі!
Лунаді цені мужных выяў
на уладзімірскай зямлі.
Узнёсся памяццю жывою
Пакроў, як лебедзь,
над Нэрлі…
Гляджу ў мінулыя стагоддзі
і бачу: мудры прашчур мой

прайшоў легендаю ў народзе,
як лёгкі воблак над зямлёй.

* * *

Калі нараджаецца песня
і ажываюць радкі,
хочацца добрае здзейсніць,
да сэрцаў ісці напраскі.

І я,
        падуладны настрою,
не буду без мэты блукаць,
а недзе,
        за нейкай вярстою,
на шчырасць песню настрою,
каб людзям яе перадаць!

* * *

Ты кажаш, бору не баліць,
калі ў ім сосны высякаюць,
калі ў ім травы высыхаюць
і больш жывіца не бруіць.
Ты кажаш, бору не баліць
і людзі перад ім не вінны?..
А бор пратэзамі рыпіць
і хіліць долу верхавіны!..

* * *

Мы – пракорі ў сваёй Айчыне,
хочам шчасця і хочам згоды.
Народу без нас немагчыма,
як і нам – без народа.
Не былі мы ніколі бязродныя.
Поруч з намі прашчураў постаці.
Беларусь мая, маці родная,
слухай словы сваіх апосталаў.

Репозиторий ВГУ

* * *

Вятры зямныя –
ганцы кантынентаў –
сеюць дажджы і
трывожаць Сусвет,
нібы калыску,
гайдаюць планету
і развяваюць
хвасты камет.
Не прыкаваны
да раскладу сіноптыкаў,
не падуладны
ні д’яблам
ні багам,
вятры зямныя
патрэбны космасу,
вятры зямныя
патрэбны нам.

Так патрэбны,
як скібка хлеба,
як жытні колас і першы гром,
як лесу – песні,
як птушкам – неба,
як дзецям –
родны бацькаўскі дом.

## НА ІВАНА КУПАЛУ

Граюць скрыпачкі і цымбалы.
І пайшло ад сяла да сяла:
нарадзіўся Янка Купала,
кветка папараць расцвіла.

Цёмна ў пушчы. Зусім не відна.
Крукі лётаюць, кажаны,
Ажылі русалкі і відмы,
старадаўнія курганы.

Поўнач блізка. Варушацца блікі.
Совы вухкаюць – не стрываць!
Сцежкі зблытаны – не разблытаць.
Чары ў пушчы – не расчараваць.

Репозиторий ВГУ

Рэха чуецца – знічка ўпала.
Пушча ветрана загула:
нарадзіўся ЯНКА КУПАЛА –
кветка папараць расцвіла.

* * *

Я слухаю Коласа,
я слухаю Коласа
У кожнай травінцы,
у кожным лістку,
У кожным
прачытаным мною радку,
У кузаве дрогкім,
у людным аўтобусе,
У пыльным вагоне,
у скорым таксі,
У кожным кутку,
што адзначан на глобусе,
На сцежках усіх,
на дарогах усіх,
У песні натхнёнай,
у лістападаўскім шолаху,
У першым каханні
сваім трапяткім,
У першым дажджы,
у вясёлкавым сполаху,
Я слухаю Коласа
у сэрцы людскім.

* * *

Зямля любімая, з табою
вузлом навечна звязан.
З неразгаданаю журбою
іду
да шумных вязаў
пакратаць лісце трапяткое,
паслухаць спеў прырэчча,
каб у дарогу ўзяць з сабою
і песні, і сустрэчы!



Репозиторий ВГУ

## ЗЯМНАЯ СІМФОНІЯ

Гайдае шпак
галінку зялёную,
цвіркочуць конікі
ў траве.
І тугімі,
як струны,
промнямі
сонца іграе ў лістве.
Чмялі –
чубатыя трубачы –
мядзяныя трубы прынеслі.
За нотаю
новая нота
гучыць,
за песняю –
новая песня.
П’юць ласі, нібыта нектар,
ваду з ледзяной крыніцы.
А ластаўка,
узяўшы старт,
маленькай ракетаю мчыцца…
Родная ластаўка,
гнёзды ладзь,
выводзь сваіх птушанят, –
няхай пад страхою шчабечуць –
звіняць,
вітаюць
пачатак дня.
Няхай
у бяссмерце
Зямля плыве,
гукамі перапоўненая.
Няхай жа
вечна
слухае Чалавек
зямную сімфонію!

Репозиторий ВГУ

## ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ

*Уладзіміру Караткевічу*

Хрыстос прызямліўся ў Гародні.
І, збудзіўшы святыя сны,
запалалі паходні
мужыцкай вайны.

Праведнікі, ліхадзеі,
злодзеі, басякі
раскрыжавалі надзею
вызваліцца на вякі.

Гудуць набатна ў Гародні
разгневаныя званы –
узнімаецца люд гаротны
скінуць з сябе кайданы.

Пакутнікі і святаборцы
на дзіды ідуць і мячы
за месца сваё пад сонцам,
каб душы свае зберагчы,
смагу свабоды спатоліць,
узвысіцца да нябёс…
Іх благаслаўляе на волю
з замкавай вежы
ХРЫСТОС.

* * *

*Б.І. Эпімаху-Шыпілу*

“Загляне сонца і ў наша ваконца”, –
з вераю марыў народны мысляр.
Заспявала жалейка. Зайграла скрыпка.
Струны патужыў на гуслях гусляр.

Заракаталі боскія струны
і абудзілі родны абшар.
“Загляне сонца і ў наша ваконца”, –
марыў усцешана мудры мысляр.

“Не ачарсцвеюць людскія душы.
Як найвялікшы ў свеце дар
загляне сонца і ў наша ваконца”, –
марыў узлётна шчаслівы мысляр.



Репозиторий ВГУ

Спраўдзяцца мары доўгіх стагоддзяў,
бо немагчыма жыць без надзей:
загляне сонца і ў наша ваконца,
толькі ж ці будзе бязвоблачным
дзень?..

## ВЫТОК

*Зінаідзе Ігнатаўне Канапельцы*

Не Алазанская даліна –
дзівосны казачны куток, –
тут твой выток, твая краіна,
дзе ў жыце звонкі васілёк,
дзе так азёрна і крынічна,
на золку зорны халадок,
заўжды знаёмы і прывычны
над хатай матчынай дымок,
дзе столькі песень, столькі танцаў
і Млечны Шлях аж да відна!..
Сярод усіх вялікіх станцый
ёсць невялічкая,
адна,
дзе верасовы свет палоскай
плыве
у вечаровым сне…
…Растуць дзяўчаткі, як бярозкі,
у багушэўскай старане.

## БЕЛАРУСКАЯ МАДОННА

*Зінаідзе Ігнатаўне Канапельцы,*
*народнай артыстцы Беларусі*

Я заўсёды на Вас малюся.
Малітва з вуснаў маіх злятае.
Мадонна роднай маёй Беларусі,
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – святая!

Нялёгкі шлях з нялёгкаю ношкаю…
А Вы прыгожая і маладая.
У Вашых вачах сінеюць валошкі.
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – святая!



Репозиторий ВГУ

У Вашым сэрцы агонь Мельпамены.
Тайны агню хто разгадае?..
А ён разгарыцца, крылаты, на сцэне.
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – святая!

І забываюцца горыч і беды,
І надыходзіць жыцця світанак.
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – легенда.
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – святая!

Няхай жа над Вамі анёл лятае,
Жывіце ў радасці, а не ў скрусе.
Зінаіда Ігнатаўна, Вы – святая!
Мадонна святой маёй Беларусі!

* * *

Гасцінна да сябе паклікала
радзіма Барадуліна і Быкава,
радзіма Еўдакіі Лось і Броўкі…
Паклікалі вушацкія гаворкі.

Ад Кублічаў, Пуцілкавіч, Старынкі
зіхцяць, як росы, словы-залацінкі.
Рассыпаны ў азёрах і ў барах.
У кожным слоўку – чабаровы пах.

У кожным слоўку – птушак галасы.
У кожным слоўку – шолах верасны.
У кожным слоўку – мудрасць, дабрыня,
бясконцасць ночы і ўрачыстасць дня.

У кожным слоўку дадзены зарок
нашых бессмяротных мацярок.
На мяне глядзяць з далёкай сіні
вочы Мамы, цётак Ганны і Куліны.

Репозиторий ВГУ

* * *

*Уладзіміру Паўлаву*

Яшчэ далёка
наш прывал,
яшчэ лунаюць летуценні…
Жыццё –
заўсёды светацені
і невядомы перавал.

А мы здзіўлёнымі вачыма
глядзім на кожны новы дзень.
На плечы нашыя
Радзіма,
як рукі,
прамяні кладзе.

* * *

*Васілю Быкаву*

Журботная ўсмешка Быкава.
Мудры прышчур вачэй.
А ў іх агеньчыкі звыклыя,
ад якіх на сэрцы ярчэй.
Позірк знаёмы, прарочы,
праніклівы…
Бачацца ў ім
дні франтавыя і ночы,
пажарышчаў горкі дым,
і незваротныя страты,
і вера ў заўтрашні дзень…
Сейбіт, руплівы араты
добрых, як праўда, надзей.
На вятрах-скразняках распяты
жураўліны трывожны крык.
Высака Вамі ўзняты
Апостальскі крыж.

Праведны і суровы,
набліжаецца новы век.
На скрыжалях святыя словы:
ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ,
ЖЫВЕ!..



Репозиторий ВГУ

* * *

*Міхасю Стральцову*

Блакітны вецер,
блакітны вецер
адзіны ў свеце,
адзіны ў свеце!

Ты б’еш у грудзі,
дабра мне зычыш,
з табой заўсёды
ў дарогу клічаш.

Ты не губляйся
ў зялёным вецці,
блакітны вецер,
нястомны вецер.

З табою разам
вітаю ранне,
тваё дыханне –
маё дыханне!

## ІДЗЕ ПА ВІЦЕБСКУ ПАЭТ

*Давіду Сімановічу*

Ідзе па Віцебску паэт,
усміхаючыся песні.
Ў яго вачах бязмежны свет,
як весні свет у паднябессі.

Ідзе па Віцебску паэт,
вітае старыя кварталы.
У яго душы натхнёны свет,
як фарбы мудрага Шагала.

Ідзе па Віцебску паэт
узлётнай пушкінскай хадою.
Сабою лучыць спеўны свет,
з вясною маладою.

Ідзе па Віцебску паэт
і радуецца сонцу:

Репозиторий ВГУ

навокал васільковы свет,
вясёлка на праменнай гронцы.

Ідзе па Віцебску паэт,
імкліва, узрушана і дужа.
Ідзе паэт у добры свет –
і сонечна ў сяброўскіх душах.

Ідзе па Віцебску Паэт!..

*** * ***

*Еўдакіі Лось*

“Я з табой,
Несмяротны народзе!..” –
чую голас крылатай душы.
А яна
з Мілавіцаю ў згодзе
усміхаецца з небных вышынь.
А яна,
            летуценніца,
                        верыць
у зямную любоў і ў людзей…
І спявае натхнёная Лера
у сузор’і Вясновых Надзей:
“Я з табой,
Несмяротны народзе!..”

## ПАМЯЦІ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

Бярозка плача мнагаплачка,
схіліла нізка галаву.
А ля Вушачаў, ля Вушачаў
закрылі хмары сіняву.

А ля Вушачаў зорка ўпала
і ветах зледзянелы знік,
зямлю халодным пакрывалам
акрыў завейны сакавік.

Застыла рэчачка Вушачка
да красавіцкага святла,



Репозиторий ВГУ

бярозка Ваша мнагаплачка –
крыло галубкі і арла.

* * *

*Рыгору Барадуліну*

Радзіма белая буслоў
у вырай зорны акрылёна.
Вяртацца мудра і натхнёна
вязанкі нерушовых слоў:
РАДЗІМА БЕЛАЯ БУСЛОЎ.

## ТАКІ ЎЖО ЛЁС

*Уладзіміру Арлову*

У нас не любяць сейбітаў і творцаў.
Шануюцца манкурты, махляры…
Ды не яны,
                    а мы жывём пад сонцам,
згараючы праменна без пары.
Такі ўжо лёс спрадвечны ў пракокаў:
святому людству аддаваць святло
любові Боскай і відушчым зрокам
акрэсліць мудра дабрыню і зло.

* * *

Я да крынічкі чыстае прынік,
бяру ў далоні промні асцярожна –
чытае вершы Маша Баравік
узвышана, акрылена, прыгожа.

Яе ўзлётны непаўторны лік
плыве, як ветразь, у сонечным блакіце
чытае вершы Маша Баравік –
бруя бруіцца васількамі ў жыце.

Дзівосны міг, які вядзе адлік
нястрымнай плыні, што пачуцці збудзіць.
Чытае вершы Маша Баравік –
і харашэе свет,
 і харашэюць людзі.



Репозиторий ВГУ

* * *

*Генадзю Бураўкіну*

Уваходжу ў лес –
у гармонію нерушовай зяляніны,
у гармонію птушыных сімфоній,
у гармонію вечнага шолаху
і святла.
Уваходжу ў лес,
як уваходжу ў дзіва,
як уваходжу ў песню,
што на крылах магутных
высока
Радзіму
ўзняла.

* * *

Мне так патрэбна слова
і далеч тых крыніц,
з якіх –
мая аснова,
з якіх –
Радзімы ніц!

* * *

Планета стомлена гудзе,
як дождж аблoжны.
Трывожны свет. Трывожны дзень.
І чалавек трывожны.

* * *

Я ў любові Табе не клянуся.
Тут не трэба напышлівых слоў,
бо народжаны я ў Беларусі
пад крыламі прыгожых буслоў.

Репозиторий ВГУ

** * **

Раскрыльце песню, музыку раскрыльце –
ёй вечна жыць у шолаху дубоў.
Паслухайце: тут перапёлка ў жыце,
жаўро ў зеніце – песні песняроў.

Любоў і рэўнасць, вернасць і пяшчота
звіняць натхнёна шчодрым каласом.
Імчыцца рэха – чуюцца грымоты.
Імчыцца рэха спеўным ручайком.

Мой дзіўны край у соснах і ў блакіце.
Мой дзіўны край – мелодыя жыцця.
Раскрыльце песню, музыку раскрыльце –
ёй вечна жыць
на крылах пачуцця.

** * **

Мне трэба,
каб шалясцелі дрэвы,
галасна птушкі спявалі
і нада мной, як ветразі,
вечна аблокі плылі,
зырка свяціла сонца,
начамі буялі росы
і Чалавек
нястомна
хадзіў
па бацькоўскай зямлі.

Репозиторий ВГУ

# ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА

*“Мой свет адкрыты шчасцю*
*І дабрыні людской.*
*Нялёгка песню скласці*
*І стаць самім сабой.”*

Філасофскую лірыку А. Канапелькі складаюць вершы-роздумы пра асноўныя пытанні жыцця чалавека, пра вечныя ісціны і каштоўнасці.

Спакойна, глыбока гучаць радкі пра шчасце і гора, сяброўства і расстанне, жыццё і смерць, прымушаючы чытача задумацца над тым, хто мы такія, адкуль прыйшлі, да чаго імкнемся.

* * *

Яшчэ адна восень
паляцела ў вырай,
развеяла,
рассеяла
барвовы лістапад.
Вецер трубіць у рог,
услаўляючы крылы
тых, хто не знае
дарогі назад.
А навошта знаць?
Што не ўбачана – страчана,
што зрабіў,
што любіў,
што дарыў – тваё.
Яшчэ ніхто
не змог
мінулае перайначыць,
усе ж будуюць
будучае сваё.
І ў кожнага з нас
вырастаюць крылы,
мацнеюць яны,
як з вятрамі сустрэнуцца.
…Яшчэ адна восень
паляцела ў вырай,
яшчэ адна восень
не вернецца.

Репозиторий ВГУ

## ВЕРА

Я веру у зямное цяпло.
Я веру шумлівай лістоце
і птушцы, якая ў палёце,
яе ўсхваляванай ноце, –
я веру у зямное цяпло!

Я веру ў іскрыстае рэха,
якое імчыцца, як рэхва, –
я веру ў зямное цяпло!

Я веру ў зямное цяпло,
якое, як рукі матулі,
заўсёды пяшчотна атуліць
утульным крылом, –
я веру ў зямное цяпло!

Я веру ў зямное цяпло,
разумнай і добрай планеце,
адзінай у вечным Сусвеце,
дзе у сэрцах не гасне святло, –
я веру ў зямное цяпло!

* * *

Няспынны час.
Імклівы час!..
Вяртанне радасці і болю,
той цішыні,
што кожны раз
лістотаю вітала нас
і шалясцела над табою.

Я знаю – часу не спыніць,
з былым ніколі не сустрэцца.
Нястрымна тчэцца часу ніць.
Няўжо раптоўна абарвецца?..

Репозиторий ВГУ

## ПРА СУЧАСНАСЦЬ

Сучаснасць –
лебядзінае крыло,
цень пругана
і вечная крыніца.
Сучаснасць –
навальніца.
дзе святло,
і цень,
і кожны дзень
трывожны,
як граніца.

* * *

Там, дзе роздум вечаровы
ды бярозак ціхі сум,
сон праходзіць каляровы,
лістападны шум.

Адплывае сіні ветразь,
адплывае сіні дым,
адплывае ў край,
дзе вечнасць
падуладна маладым!

Адкрываю свет на нанова,
адкрываю дзіўны свет –
мудрасць матчынага слова
і пазнання смелы след.

## ПРА КАЗКІ

А недзе
кружыць чорны воран,
жыве бязлітасны Кашчэй,
і на зямлі хапае гора,
хапае жорсткасці яшчэ.
І плача сціплая Алёнка.
Азябла – ножкі абвіла.
Балюча робіцца і горка,



Репозиторий ВГУ

што столькі зла,
што столькі зла!..
Нялёгка з горам прымірыцца:
куды ж падзелася дабро?..
Не плач гаротная сястрыца
і над табою загарыцца
жар-птушкі добрае пяро!..
Кашчэй зачахне.
            Сціхне воран.
І сонца выгляне з начы.
На самым дне
            ў сінім моры
ад шчасця
            знойдуцца ключы…
Не моўкні,
казкі голас звонкі,
ты са спагады
і святла!
…Не перагорнуты старонкі
дабра і зла,
дабра і зла!..

* * *

*"…Зямля падобная на яблык.*
*Толькі Зямля большая".*
Ул. Камароў

Трымаю яблык,
як маленькую планету,
напоўненую сонцам і жывіцай.
І думаю,
сябе
на тым лаўлю:
як лёгка
раскалоць
вось гэты плод,
падобны на Зямлю!..

* * *

Трывожце, дарогі і добрыя сны,
трывожце, барвовыя ветры вясны,
нясіце бязмерную радасць сваю,



Репозиторий ВГУ

нясіце няхітрую песню маю,
каб толькі не ведаць спакою нідзе,
каб толькі ўпасці ў імклівай хадзе!

* * *

Часамі сумняваюся,
пазнаць
усё
хачу!
Бывае –
памыляюся,
бывае –
прамаўчу.
Ніколі толькі ворага
сваім
не назаву!..
Жыццё,
як ёсць,
мне дарага,
а значыць,
я – жыву!

* * *

Людзі – не эталоны,
вельмі ж розныя людзі:
Адны,
нібы цені,
паўзуць вазамі перагружанымі,
Другія,
неспакойныя,
бягуць-спяшаюцца
адкрыць зямныя скарбы;
Адны
з галавой зашываюцца
ў ракавіну мяшчанскага быту,
Другія
ўглядаюцца
ў далеч Галактыкі;
Адны
жывуць доўга,
захоўваюць рэжым і дыету,



Репозиторий ВГУ

Таргуюцца з бліжнім,
не перададуць згарача
нават ласкавага слова,
Другія,
як метэоры,
згараюць,
аддаўшы святло душы
Стагоддзям і чалавецтву,
будучаму жыццю.
…Людзі – не эталоны,
вельмі ж розныя людзі.

* * *

Гляджу на глобус –
шар зямны,
і ён ажыў, здаецца.
Перад планетаю замры,
яе
паслухай
сэрца.
Вярціся, шар!...
Мацерыкі
я аглядаю пільным зрокам.
Над імі –
вецер трапяткі.
Над імі кружацца аблокі.
А рэкі,
як мерыдыяны
і паралелі,
праляглі…
Я размаўляю з акіянам,
я чую шолахі зямлі.
Я з ёю, знаю, кроўна звязан:
заўсёды вабіць далячынь.
Зямлі,
як маці,
абавязан,
а маці
трэба берагчы!

Репозиторий ВГУ

* * *

Смяецца чалавек, смяецца,
шчыруе чалавек!..
Не знае:
скора абарвецца
яго
            кароткі век.
Ён пойдзе. Схопіцца за сэрца.
Сляза ўпадзе з-пад век…
Смяецца чалавек, смяецца,
смяецца чалавек!..

* * *

Бывае так: разыйдуцца шляхі
і болей не сыйсціся ім ніколі,
як не сыходзяцца ў рэчак берагі,
і ты адзін, як лодка на прыколе…
А пройдзе час –
і праляцяць гады,
і вырai далёкія напомняць,
што ты такі ж сяброўскі, малады,
хоць сівізна і пабяліла скроні.

* * *

Задумваюся ўсё часцей
пра вернасць і адданасць.
Жыццё не робіцца прасцей,
а робіцца складаней.

Нішто
        ніколі
                не забыць!
А слова
        важыць важка:
як цяжка
        Чалавекам
                быць,
як гэта цяжка!

Репозиторий ВГУ

* * *

Я кожны дзень
сябе знаходжу,
смяюся,
дыхаю,
жыву,
размову з птушкамі заводжу,
плыву
высока ў сіняву.

Я адчуваю:
адкрываю
неразгаданы свой узлёт.
З усімі разам
сустракаю
нястрымны
сонечны ўсход.

Зайздрошчу дойліду,
ратаю.
Ніколі людзям не хлушу.
Як кнігу шчырую,
гартаю
сваю трывожную душу.

* * *

Мой ранак –
песенны світанак,
птушыны несціханы грай
і самы чысты небакрай,
смугою сіняю сатканы.

І так заўсёды:
росны ранак
і дзень, як вечнасць!
Стома – прэч!
Мой ранак –
Сонечны паўстанак,
а поўдзень –
станцыя Сустрэч.

Репозиторий ВГУ

* * *

Не кідайце
на Чалавека
цень,
не кідайце!
Кожную раніцу,
кожны дзень
Чалавека
вітайце!
Чалавеку заўсёды
верце
адкрыта і чэсна!..
А прамень жыцця абарвецца –
жыццё
прадоўжыцца
ў песні!..

* * *

У чалавека крылы – як у птушкі.
Узмах крыла – і вось жаданы міг:
і ты імчыш у зорную бязважкасць!

І ты імчыш праз промні і вятры
туды, дзе сонца, дзе блакіт бясконцы, –
о, дзіўны міг узлёту і падзення!

І значаць шлях сузор'і гарадоў,
што так падобны на сузор'і неба,
на гронкі лістападаўскіх рабін.

Шляхі зямныя, зорныя шляхі
наканавана зведаць Чалавеку.
І Чалавек становіцца Ікарам!

РОЗДУМ

Лаўлю я прагна колаў стук.
Насустрач –
хвойкі ды бярозкі.
Лічу я кожную вярсту –
маленства адгалоскі…



Репозиторий ВГУ

Ці мог тады я
разгадаць,
хлапчук шасцігадовы,
што бацька мне
паспеў аддаць
жыцця свайго
аснову!
Таму струменіцца блакіт,
гарчыць
дарожны вецер,
бягуць
юнацтва цягнікі,
і ўслед
махаюць дзеці…

* * *

Хоць сэрца не змяшчае боль,
я не прашу спагады,
не прыкрываюся жальбой
ад жорсткае няпраўды.

Няпраўду цяжка разгадаць,
нялёгка з ёй змагацца:
патрэбны меч –
каб нападаць,
і шчыт –
абараняцца.

* * *

Бывае –
чую галасы
і ўдзень і ўноч:
– Ля ветраломнай паласы
не кроч!
Віхор узніме, панясе
і косці растрасе!..
– Ля ціхай завадзі жыві
цішэй вады,
ніжэй травы…
Так,
ёсць на свеце дзівакі.



Репозиторий ВГУ

Ім мой адказ такі:
пакуль жыву,
пакуль люблю
нябёсы і зямлю,
мне
слухаць галасы
ветраломнай паласы!..

*** * ***

Разбудзілі мяне
грымотныя водгукі
і маланак сполахі кароткія.
Стала неяк трывожна
за зямлю,
за сонца,
за воблакі,
за цёплыя травы,
за лісце дрыготкае;
за дні гарачыя,
за ночы росныя,
за птушыныя сінія вырai,
за каханне,
за мары,
за натхненне,
за роспачы,
за ўсмешкі людскія шчырыя.

*** * ***

І толькі сталасць
мудрасцю ўсміхнецца,
і, нібы ветразь,
пабялее сад,
тады, напэўна,
кожнаму здаецца,
што ён такі,
як дваццаць год назад…

Репозиторий ВГУ

* * *

Я ў слове адчуваю цішыню,
крынічны звон і шолахі лістоты,
і радасць надыходзячаму дню,
які нясе штодзённыя турботы.

Я ў слове адчуваю цэлы свет,
што ў спадчыну мне дадзены спрадвеку.
У слове нараджаецца Паэт
і Песня, што ўслаўляе Чалавека.

* * *

Не трэба Чалавеку адзінота:
агорне сум – ты да людзей
спяшы.
І пасярод натоўпу і машын
забудуцца штодзённыя
турботы,
і тое,
што на свеце –
не адзін,
і тое,
што жыццё –
не асалода.
…Не трэба Чалавеку адзінота:
агорне сум –
ты да людзей ідзі!..

* * *

Заўсёды веру шчырасці
і дабрыні людской.
І незямны спакой
бярозкай тонкай вырасце.

Пачую шолах ценю,
лістоты гаманкой.
І незямны спакой
асвеціцца ў зіхаценні.

Репозиторий ВГУ

* * *

*Мікалаю Цішачкіну*

Адыходзяць сябры, адыходзяць
імгненна і недарэчна.
Адыходзяць сябры ў Вечнасць,
бліскавіцаю адыходзяць.

Адыходзяць сябры на ўзлёце
у бязмежна далёкую далеч.
Сэрца ў жалобе рыдае
у неверагоднай сумоце.

Заклятая доля горкая.
Цяжка яе зразумець:
Чалавек нараджаецца Зоркаю,
каб нечакана згарэць.
Няма на Зямлі справядлівасці.
Скажыце, а праўда дзе?..
Найлепшыя з людзей
у жыццёвай згараюць імклівасці.

Нястрымны лунае дух
Любові, Дабра, Натхнення…

…Адыходзіць у Вечнасць Друг.
У ВЕЧНАСЦІ – УЗНЯСЕННЕ.

ПАМЯЦІ СЯБРА

*Валерыю Атрашкевічу*

Не верыцца,
        не верыцца,
                не верыцца!
Трубка тэлефонная маўчыць.
Няўжо са студзеня
        жалобнага не вернешся?..
Згарэў імгненна,
        як згарае зніч.
Няўжо твае вядомыя Ушачы
і Полацк не сустрэнуцца
        з табой?..
На жаль,
        нічога нельга
                перайначыць –

няма вады жывой.
За морамі,
за горамі,
за трыдзевяць зямель
закружылася завірухаю
нечаканая чорна-бель,
замарозіла ўсе крынічанькі,
замарозіла да адной.
Замарозіла ўсе крынічанькі –
няма вады жывой.
Беларусь да грудзей тваіх горнецца,
нячутны жвіровы шум…
Будзе помніцца,
будзе помніцца
у вачах тваіх
        вечны шум.

* * *

Ва ўсім паэзія!
            І я шукаю словы
у людскіх усмешках,
            сіняве крыніц,
каб адкрываць паэзію нанова
з яе неразгаданых таямніц.

* * *

Ці ява,
            а ці летуценне –
яна наплывае здалёк,
трапечацца,
            як матылёк, –
лінія
            сонца і ценю.

* * *

Мой свет адкрыты шчасцю
і дабрыні людской.
Нялёгка песню скласці
і стаць самім сабой.



Репозиторий ВГУ

* * *

Чалавек нараджаецца жыць,
для песні сваёй нараджаецца.
А жыццё сцяжынкай бяжыць,
за далягляд хаваецца.

* * *

А лісце кружыцца,
злятаючы,
звініць.
Лісточак кожны –
па сваёй арбіце.
Ён хоча
зоркай
на зямлі адбіцца,
сцяжок барвовы
ярка
запаліць!

* * *

Не хавайце
сваіх усмешак,
не шкадуйце
ласкавых слоў
самым родным
і самым блізкім,
не шкадуйце іх
для сяброў.
Не хавайце
сваіх усмешак –
хай давер
паміж вамі будзе.
Не хавайце
сваіх усмешак.
Будзьце шчырыя,
людзі!

Репозиторий ВГУ

# ПЕЙЗАЖНАЯ ЛІРЫКА

*“Лісце,*
*агнявое лісце,*
*звонячы,*
*злятае на зямлю.*
*Чарамі ляснымі зачараваны,*
*музыку знаёмую лаўлю.”*

Уражанні, пачуцці, выкліканыя хараством прыроды роднага краю, складаюць пейзажную лірыку А. Канапелькі. Радкі вершаў адкрываюць чытачу знаёмыя і блізкія карціны родных мясцін, маляўнічыя, непаўторныя пейзажы Віцебшчыны.

* * *

Закалыхаўся бор стары,
абуджаны,
калматы,
Снуюць зялёныя вятры,
свае згубіўшы хаты.

Хмурыны крон,
Ствалы, як медзь,
Жывіца ўся іскрыцца.
Тут дрэву нельга
не звінець,
тут птушцы нельга
не запець,
тут нельга
не спыніцца!

* * *

Далёка адплылі дажджы,
і гром сярдзіта болей не вурчыць.

А ластаўкі, зрабіўшы віражы,
паселі на карнізы адпачыць.

Па-свойму размаўляюць, але ўсё ж
я разумею ластавак размовы…
Вятрыска, птушак не трывож
перад палётам новым!

Репозиторий ВГУ

* * *

А навошта верыць цішыні,
шолаху разбуджанай лістоты?...
Палыхаюць сполахі зарніц
і трывожна вухкаюць грымоты.
Навальніца чорнаю сцяною
сцелецца,
грукочучы,
здаля.
І трымціць
напятаю струною
Зямля.

ДАЖДЖЫ

Звіняць даждҗы,
звіняць даждҗы,
вясновыя,
харошыя.
Я кроплі жвавыя лаўлю
велічынёй з гарошыну.

Шумяць даждҗы,
шумяць даждҗы
за вокнамі зялёнымі.
Давай, сяброўка, пабяжым,
дзяцінства ўспомніўшы, пад кронамі.

Я вас люблю,
даждҗы, даждҗы, –
ад вас цяжэе колас.
Я вас люблю,
даждҗы, даждҗы, –
ад вас мацнее голас.

* * *

Што ты шэпчаш, задумленны бор,
што ты горыч на душу наводзіш?
Лепш паслухай, як пяе прастор
і легенды ходзяць у народзе.

Репозиторий ВГУ

Што ты шэпчаш, родны, гаманкі,
вецце апусціўшы нізка-нізка?
Можа ты складаеш на вякі
рэквіем над сціплым абеліскам?

## ВЕРАСНЁВЫ СНЕГ

Не верыцца,
проста не верыцца:
снег у верасні!
Бухматы,
ён падае,
кружыцца
і засцілае вуліцы.
Ён акрывае дрэвы, дамы…
Няўжо пачатак зімы?
Няўжо крылом узмахнуў сінім
сівер?
Няўжо верасы адцвілі?
Снег
па зямлі
і навокал белая свежасць –
снежыць!

## ТРЫПЦІХ

I

Яшчэ шалее ветравік
аснежаным крылом,
ды наступае сакавік,
і рушыў крыгалом.
І ўжо не будзе лютых сцюж…
Ад самага відна,
як ачышчэнне нашых душ,
да нас
ідзе
Вясна…

II

А над зямлёй такая ціш,
і сонца чыстае,



Репозиторий ВГУ

вясновае.
На свет па-новаму глядзіш
і адкрываеш
нешта новае.
І кожны дзень –
як адкрыццё!
На дрэвах трапяткія ўспышкі.
І чутна,
як вірыць жыццё
ад кораня і да пупышкі.

III

Ляціць пагодная завея –
бялюткі яблыневы снег.
І на тваіх дрымотных веях
яе пялёсткавы разбег.
І твой пагляд
мяне сагрэе:
я помню
колькі год назад
такую ж
майскую завею
і яблыневы белы сад.

## ЛІСТАПАД

Лісце,
агнявое лісце,
звонячы,
злятае на зямлю.
Чарамі ляснымі зачараваны,
музыку знаёмую лаўлю.

Музыка,
цудоўнейшая музыка
з дрэў іскрыцца ціхаю журбой.
Кружыцца,
і кружыцца
лістапад крамяны нада мной…

Репозиторий ВГУ

## ПЕРШЫ СНЕЖАНЬ

Вось дык снежыць,
                    вось дык снежань
першы снежань,
                    першы снежань!
Не прыпомніць нават памяць,
ці была такая замець.
Першы снежань, лёгкі, пухкі.
Сам ён просіцца ў рукі…
Як хацеў бы я паверыць
слову знойдзенаму, песні
і жыццё сваё праверыць,
летуценні здзейніць.
Ці такі пагляд бязмежны,
ці такі мой крок, як трэба?..
Ах, як снежыць
                    першы снежань!
Ах, як неба
                    снежыць!

* * *

Грукне галінкай
прамень раніцою, –
пахне вясною,
ціхай сасною.

Рэха
далёка-далёка
пакоціцца,
пакуль на вярбе
не праклюнуцца коцікі.

А вецер яшчэ
са смугой снегавою –
пахне вясною,
жаданай тугою.

А недзе з надзеяй
ля сіняга мора
знаёма гучыць
жураўліная мова.



Репозиторий ВГУ

I птушкі,
і людзі не маюць спакою, –
пахне вясной,
сінізной,
баразною…

* * *

Дзень добры, лес –
птушыныя харомы,
і цішыня, і колкая ігліца,
і дзераза, і верас, і брусніцы,
і пышныя зялёныя шаломы.
Прыйшоў да вас –
у казачнае дзіва:
няўжо яшчэ жывуць лесавікі,
і чараўніцы, і чараўнікі,
і ёсць куток –
мой астравок
адзіны,
дзе столькі песень,
столькі хараства,
дзе шолах дрэў таемны і былінны,
дзе свет мой прыгажэе штохвілінна
і кружыцца ад шчасця галава?!.

* * *

Світанне.
Раніца.
Сонца на ўсходзе ірдзее.
Крыху туманіцца.
І, як надзея,
што будзе добры
пагодлівы дзень,
мажорным басам
гудзе
авадзень
на праменьчыку сонца.

Репозиторий ВГУ

* * *

Голлем гнуткім вятры зашасталі,
у хмару грукнулі –
долу асколкі.
Над зямлёю
падковай блішчастаю
выгнулася вясёлка.
Нездарма называем неба
мы і ласкавым
і суровым:
то пашле нам
на гора
напагадзь,
то падорыць
на шчасце
падкову.

* * *

Чуеце гукі золкавай раніцы,
чуеце промня світальнага спеў?..
Граем птушыным і шолахам дрэў
насцеж сонечны дзень адчыняецца.

Репозиторий ВГУ

# ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА

*“Маёй любові снежны зарапад*
*плыве ў прасторы характва зямнога...”.*

Адметную і цікавую старонку беларускай паэзіі складае інтымная лірыка А. Канапелькі, якая передае розныя адценні найпрыгажэйшага з чалавечых пачуццяў – кахання.

Спавядальна, прачула, задушэўна паэт расказаў пра шчасце сустрэч і горыч расстанняў, пра беражлівыя адносіны да спадарожніц жыцця. Большасць вершаў лірыкі кахання прысвечаныя жонцы Святлане.

* * *

А вось і плытная завея,
бялюткі яблыневы снег.
1 на тваіх дрымучых веях
яе пялёсткавы разбег.
1 твой пагляд мяне сагрэе:
я помню колькі год назад
такую ж майскую завею
і белы яблыневы сад.

*** * ***

Мне ўсё чагосьці нестае,
чагосьці я шукаю.
І слова ў вуснах растае,
калі цябе гукаю.

І сумна робіцца і горка –
жыву ў трывожным сне.
А ты далёка,
ты далёка,
ты так далёка ад мяне!

*** * ***

Ля сосен кашлатых
цвітуць верасы…
Нядаўна прайшла ты
у кроплях расы.

Репозиторий ВГУ

І шэпчуцца шаты
і шолахі дня.
Ля сосен кашлатых
прайшла
    цішыня.

## ЗОРКА СВЯТЛАНА

* * *

Красавік
    пяшчотаю ціхаю цепліцца
з самага рана.
Поруч са мною надзеяю свеціцца
зорка Святлана.

Гляджу на яе, каб прывеціцца,
зачаравана.
Поруч са мною верую свеціцца
зорка Святлана.

Пралескаю сціплаю ўсмешка развесніцца
так нечакана.
Няхай жа любоўю праменнаю свеціцца
зорка Святлана.

* * *

Перад табою трымаю споведзь,
табой, як праўдай, даражу.
Твае ўсе сны са мною ходзяць
па сцежках тых, дзе я хаджу.

А на далёкіх раздарожжах
я адчуваю твой пагляд.
І неяк робіцца трывожна
сярод заснежаных прысад.

А як хацелася б пачуць мне
у промнях ветранай вясны
неразгаданыя пачуцці
і недагледжаныя сны!

Репозиторий ВГУ

ЧАКАННЕ

Ты ад’язджаеш
і прыязджаеш.
Цябе я праводжу
і сустракаю.
Часам, самотны,
услед за табою
рэха гукаю,
рэха гукаю!

А недзе далёка
дымок паравоза,
грукочуць насустрач,
бягуць кіламетры,
і нізка схіляюцца
долу бярозы
ад скорага ветру,
ад скорага ветру!

А ты задуменна
глядзіш у акенца
і, пэўна, сустрэчы
са мною чакаеш,
і, пэўна, таксама
усім сваім сэрцам
адзінае ў свеце
рэха гукаеш!

* * *

Ад цябе я чакаю лістоў,
самых добрых, ласкавых слоў.
Іх чакаю, нібыта свята, я:
як жывеш ты ў гасціннай Латвіі?
Там, магчыма, ідуць дажджы,
барабаняць у вакно капяжы,
і чуллівае мора з табою
ні хвіліны не знае спакою,
усё хвалюецца і ракоча,
тайны сэрцаў падслухаць хоча.
А над морам чайкі стракатыя…
Як жывеш ты ў бурштыннай Латвіі?



Репозиторий ВГУ

А калі там імжа цярусіць,
сонца вышлю
табе
з Беларусі.

* * *

Без цябе і радасць для мяне не радасць,
без цябе і сонца хмурным робіцца.
Паглядзі –
над намі ззяе радуга
і дажджынкі ў шалясценні дробяцца.
Паглядзі –
пад каляровым ветразем
зямля плыве
і крышачку гайдаецца…
А я з табой іду ў лірычны верасень,
і новы дзень па-новаму вітаецца.

* * *

Маёй любові снежны зарапад
плыве ў прасторы хараства зямнога.
Такога дзіва, як зімовы сад,
нідзе не бачыць, светла-трапяткога,

узлётнага і лёгкага, як дым,
які чаруе ў шэрані праменнай
маёй любові мудрыя гады,
пражытыя прыгожа і сумленна.

Спрадвечны сад, як мройная душа,
узнесеная ў белі сіняй-сіняй.
Вы чуеце, галінкі ў ім шуршаць
і сеецца духмяна-пухкі іней.

Аснежаны, шчаслівы, вельмі рад:
нас не кранула горычы трывога.
Маёй любові ціхі зарапад
плыве ў прасторы хараства зямнога.

Репозиторий ВГУ

* * *

Завея круціць,
як прадонны вір,
а мы ніяк не можам развітацца.
Не трэба сумнявацца
ў любві,
у шчырасці
не трэба сумнявацца.
Я прысягаю
іменем тваім,
тваёю вернасцю,
тваёй любоўю.
…Над намі вечар,
мройны снежны дым,
і мы ўдваіх
на ўсёй зямлі
з табою.

* * *

Галёкае рэха спакуслiва
недзе
ў кусцістай цішы.
Пойдзем са мной па арэхі
шукаць спарышы.

Паспытаем капусты зайцавай
у цяністым густым вішшы.
Пойдзем са мной па арэхі
шукаць спарышы.

Там,
ля арэшнікаў грэшных,
словы знайду для душы.
Пойдзем са мной па арэхі
шукаць спарышы.

* * *

Ці вечарам зорным,
ці сонечным ранкам
шчаслівай дарогі,
Святланка-вяснянка.



Репозиторий ВГУ

Хай вецер сустрэчны,
будзе пяшчотным,
і яснымі –
зоркі,
і сонейка –
шчодрым,
і лёгкімі –
сцежкі,
і далеч –
без краю,
і добрымі –
словы,
якіх я чакаю!

* * *

Ты – як песенька, ты – як сонейка,
ты – як радасны ручаёк,
ты – як ластаўка з цёплых выраяў
прыляцела ка мне здалёк.
Прыляцела,
узяла за рукі,
захмяліла
сваёй смяшынкай,
заіскрылася
закружылася
зіхатлівай
лёгкай сняжынкай,
паплыла
ў вясёлым танцы
у праменнасці трапяткой…
Ты – такая зямная, блізкая,
а здаешся зусім незямной!

* * *

Ты толькі пакліч –
і цябе я пачую
у росным світанні,
у шолаху дрэў.



Репозиторий ВГУ

Ты толькі пакліч –
да цябе палячу я,
каб ціхай пяшчотай
ізноў абагрэць.

Ты толькі пакліч –
і трывогі развеюцца,
навек развітаюся
з сумам-журбой.

Ты толькі пакліч –
і мне раптам паверыцца:
спявае зямля
аб сустрэчы з табой!

* * *

Любімая,
не трэба сумаваць,
ты паглядзі,
які харошы вечар!
Давай руку –
і пойдзем сустракаць
заўсёды неразгаданую
вечнасць.
Давай руку –
і пабяжым услед
за радугаю
вогненнай каметы.
Няхай здзіўляецца
ад захаплення свет
і кружыцца
імклівая планета!
Няхай заўсёды
кліча далягляд,
нябеснае
маленькае жаўро…
Любімая
бяжым у зарапад,
туды, дзе родны
плешчацца Дняпро!..

Репозиторий ВГУ

* * *

Ты – мой прамень,
мая усмешка,
Мой добры дзень
і сінь нябёс,
Ты – зорны спеў
і мудрасць снежня,
і яснасць белая бяроз,
і чысціня крынічкі светлай,
і яркасць znічкі трапяткой,
і дабрыня любві зямной,
і шчырасці прыветнай.

* * *

Самыя добрыя песні,
што складаюць паэты і птушкі,
належаць табе.
Самыя добрыя кветкі,
што знойдзены мною на сцежках лясных,
належаць табе.
Самыя добрыя ўсмешкі,
што зоркі далёкія дораць,
належаць табе.
Самыя добрыя словы,
што сэрца заўсёды хвалююць,
належаць табе.
і самае добрае імя,
што шапчу, як малітву,
належыць табе!

ВЕРАСКІ

* * *

Дум акіян.
Стаю ў забыцці.
Якою дарогай ісці?..
Я ступаю
той,
каб вечна
ісці за табой,
СОНЦА!



Репозиторий ВГУ

* * *

Зусім цябе не дакараю
і толькі голасна малю:
заўсёды будзь падобна маю,
прынось акраску на зямлю.

Зусім цябе не дакараю,
хоць лістапад, хоць снегавей.
Я сэрцы людзям адмыкаю –
няхай становяцца дабрэй.

* * *

Жыве Паэзія ў душы
прыгожай Верасовачкай.
З каханай рай і ў шалашы –
няхай смяецца сонечна!

Репозиторий ВГУ

# П Е Р А К Л А Д Ы

Асобае месца сярод літаратурнай спадчыны А. Канапелькі займаюць пераклады. Высокай ацэнкі заслугоўвае яго перакладчыцкая дзейнасць. Ён добра ведаў сусветную літаратуру, цікавіўся культурай суседніх народаў. Перакладаючы, паважліва адносячыся да аўтараў, стаў праніклівым чытачом-суразмоўнікам, дасягнуў сэнсава-мастацкай адпаведнасці перакладу і арыгіналу.

*Аляксандр Сяргеевіч Пушкін*

ПЯСНЯР

Ці чулі вы, як у цішы начной
Пясняр любові і пясняр самоты
Спявае, каб пазбыцца адзіноты,
І гук жалейкі льецца над зямлёй?
 Ці чулі вы?

Ці сустракалі ў нерушы лясной
Вы песняра любові і самоты,
Калі ён усміхаецца пяшчотна
З паглядам ціхім, сумнаю душой?
 Ці сустракалі вы?

Ці ўсхваляваны, слухаючы ноч,
Калі пясняр любові і самоты
У сэрца увабраў нябёс грымоты,
Пакутны позірк бестурботных воч?
 Ці ўсхваляваны вы?

* * *

*Аляксей Мішын*

БУЛЬБА

Каму харчо,
Каму цыбулю,
Каму што-небудзь паямчэй.
А мне на стол нясіце бульбу –
Клубіся, пара, гарачэй.



Репозиторий ВГУ

Я помню поле ў снежных гурбах,
Зямлю, парослую сіўцом.
О, як тады чакалі бульбу,
Хаця б з грачынае яйцо!

Была яна – знікала горыч,
Ратуючы ад горкіх бед.
Яе з падручнікамі поруч
Насіў я ў школу на абед.
Яна шыпела на загнетку
У самых ёмкіх саганках,
І маці
            з ёю
                    ішла ў адведкі
Да парадзіх на хутарах.

Яна збаўляла ад загубы
Яна – і каша, і камы.
Каб у вайну не тая бульба,
На чым бы выехалі мы?

*Пераклад з рускай мовы*
*Анатоля Канапелькі*

* * *

*Максім Рыленкаў*

Ці многа мне трэба – акраец хлеба,
Драбочак солі
І водар палынны,
Са спадарожнікамі размовы
У дрогкай машыне.

Голае зязюлі ў глушы чарналесся,
У кронах частых.
Да сэрца майго падступае песня,
Як словы шчасця.

*Пераклад з рускай мовы*
*Анатоля Канапелькі*

Репозиторий ВГУ

* * *

*Юрый Пашкоў*

Красуе жыта.
Сонейка імкліва
У далоні падарожніка ляціць.
Жытнёвы цвет выходзіць зіхатліва
І залатымі рожкамі глядзіць.

І мільгацяць дрыготкія калоссі,
Як аксамітавыя сытыя чмялі.
А водар
па зямлі
разносіць
Шчаслівы шолах мацеркі – зямлі.

*З рускай пераклаў*
*Анатоль Канапелька.*

* * *

*Вальдэмар Калінін*

МАЙМУ РОДНАМУ МЕСЦУ

Не пройдзена шчэ й паўдарогі,
А глянеш часамі назад –
Убачыш маленства парогі,
Вясновы вясёлкавы сад,
Дамок невялічкі ля рэчкі,
Абрывісты бераг круты.
Тут з сябрукамі штовечар
Мы майстравалі плыты,
Бачу – плывуць прад вачыма
І вёсны, і леты, і зімы,
Голасны двор гаманкі,
Над вёскай дымоў стаўбункі,
Ранішні золкі туман,
Тужлівыя песні цыган,
Мовы жывой серабро,
Сэрцаў адкрытых дабро,
І я, цыган малады,
Вяду каня да вады,
А поруч мая спяваначка,



Репозиторий ВГУ

Маладзенькая цыганачка…
О край мой –
жыцця вытокі !
Імкнуся да вас здаля,
Найлепшыя ў свеце аблокі,
Найлепшыя ў свеце зямля.
Адсюль мой узлёт крылаты.
Тут спрадвечная спадчына,
Буслы над бацькоўскай хатай,
Незабыўная песня матчына.

*Пераклад з цыганскай мовы*
*А. Канапелькі*

* * *

*Ян Баршчэўскі*
*Пецярбург, 1839 год, 2 жніўня*

Духі нябесныя – воблачкі вечныя,
Што выплываюць, як сны чалавечыя.
Незлічоныя светы, галактыкі зорныя,
Заўсёды бясконцыя і непаўторныя.
Сузор'і без межаў, прастора ў прасторы,
З намі, зямлянамі, мудра гавораць.
Незразумелыя іх таямніцы
Хутка адчуем, як міг бліскавіцы.
Пан наш прыйшоў. Ён пакінуў нябёсы,
Ў светлым блакіце – нязгасныя росы.
Прыйшоў на Зямлю Ён, асвечаны Сонцам,
Настаўнік Сусвету і наш Абаронца.
Божага Сына віталі не з лютняй –
Раскрыжавалі пакутна і люта.
Счарнелі планеты ад жалю, трывогі,
Зляцелі у бездань з бязмежнай дарогі.
Вірыць Акіян без ніякіх надзей –
Сонца згарэла ў вачах людзей.
Укленчыўшы, грэшнікі чуюць з алтара:
Крыж. Вера. Ахвяра.
Па волі Тварца, як сведчаць пісьмёны,
Захованы людству святые імёны,
Апосталы Веры, Надзеі, Любові,
Прыгожыя словы Боскае мовы.



Репозиторий ВГУ

І толькі пріхільнікі Здрады і Здзеку
Прымаюць уладу чорнага Пекла.
Дзе ж Вера? Дзе ж Праўда? Дзе ж сэрцаў трывога?
Ці знойдзена ў душах дарога да Бога?

* * *

*Ян Баршчэўскі*
*Пецярбург, 1837 год, 4 жніўня*

Лятуць мае думкі ў край,
Дзе, кожны куточак помнячы,
З'явіўся б чароўнай поўначчу
Ў прысадах знаёмых ліп
І ўбачыў майго Анёла. –
Забілася б сэрца вясёла.

Імгненне жаданай сустрэчы
Ў росах сузор'яў тае.
Няхай бы хвілінка тая
Мне стала працягам у вечнасць.

* * *

*Ян Баршчэўскі*
*Пецярбург, 1839 год, 8 мая*

У падарожжы час вясёлы.
І вось са мной фурман суровы.
Імкліва коні, як саколы,
Лятуць праз нівы і дубровы.

Фурман трымае моцна лейцы.
Мінаюць вёрсты, гоні, горы.
Насустрач нам зямля нясецца,
Яе бязмежныя прасторы.

Спяваюць бомы, пыл клубіцца,
Як шлейф аблокаў, за вазком.
З нябёсаў зорка ўжо глядзіцца,
І ветрык вее халадком.



Репозиторий ВГУ

Мігцяцца цені навакола.
Лясныя чутны галасы.
Імкліва коні, як саколы,
Лятуць праз цёмныя лясы.

Заснулі птушкі, больш не квеляць,
Маўчаць крукі і пугачы.
Як добра ў думках летуценіць
І слухаць шолахі начы.

А нада мной праменьчык зоркі,
Як свечка Божая, дрыжыць.
У мроях бачу шлях далёкі,
Які насустрач нам бяжыць.

Не раз ужо агеньчык яркі
Знікаў і здраджаваў жаданню:
Ці то заслоняць раптам хмаркі,
Ці то зацемніцца ён даллю.

Я знаю: зорка не пагасне
У небнай стоенай цішы.
Яе агеньчык вечна шчасны
Ў маёй асветленай душы.

Зіхціць ён і ў душы Анёла.
І хоць няблізкая дарога,
Імкліва коні, як саколы,
Лятуць да роднага парога.

* * *

*Тадэвуш*
*Лада-Заблоцкі*

## У АЛЬБОМ ПАНІ К…СКАЙ

Штож напісаць у альбоме тваім невялічкім?
Незнаёмка, у промнях вясновага сонца
Ты прыгожа асветлена сіняй крынічкай,
Марай шчаслівай са мною вандруеш
 па роднай старонцы.
Што ж табе напісаць?



Репозиторий ВГУ

Ты – крынічка святога натхнення.
Ў сэрцы маім і вандроўнай душы.
Лёс мой віхурны пазбавіў цярпення
Добрыя справы з любоўю вяршыць.
Лютня замоўкла ў трывожным адчаі.
Струны настрою на песенны лад,
Каб песня ў сэрцах людскіх загучала
Пра салаўіны сад – вінаград.
Прабач, незнаёмка, за сціплыя словы.
Успомні калісьці ў радзінным краі,
Што ты для мяне, як праменьчык вясновы,
Без цябе я змарнею ці загіну ў баі.

*Пераклад з польскай мовы*
*А. Канапелькі*

Репозиторий ВГУ

# З М Е С Т

**“ЧАЛАВЕК НАРАДЖАЕЦЦА ЗОРКАЮ…”** ............................ 3

**ГРАМАДЗЯНСКАЯ ЛІРЫКА** .................................................... 5
“Мы нарадзіліся такія...” ................................................... 5
Рэха ........................................................................................ 5
“Я веру ў тое, што люблю...” .............................................. 6
Радзіме .................................................................................. 6
Беларусі ................................................................................ 7
“Я параўнаю з дзівасілам...” .............................................. 7
“У красе красавіцкай...” ..................................................... 7
“Я – крывіч. Ты – мая крывічанка...” ............................... 8
“Зусім нечакана верасы расцвілі...” ................................. 8
“Плача над берагам чаіца...” .............................................. 8
“Ён сейбіт быў, садоўнік адмысловы...” .......................... 8
“Я слова роднае лаўлю...” ................................................. 9
Роднае слова ........................................................................ 9
Мова ..................................................................................... 10
“Расоншчына – радзінная радзіма...” ............................... 10
“Дняпроўскі край...” .......................................................... 10
Круглае ................................................................................. 11
Крынкі ................................................................................... 11
Высачаны .............................................................................. 12
“Наша вёска невялічка...” .................................................. 12
Спеўны дзень ....................................................................... 13
“Чалавечая Памяць...” ....................................................... 13
Памяць ................................................................................. 13
Франтавыя дарогі ............................................................... 14
“Колькі блізкіх і родных імён...” ...................................... 14
У Брэсцкай крэпасці ........................................................... 15
“Не хопіць дыхання...” ...................................................... 15
“Я жыву на плошчы Перамогі...” ..................................... 16
“Я чую, як зямля вібрыруе...” ........................................... 16
Вуліца бацькі Міная ........................................................... 16
На Смаленскай дарозе ........................................................ 17
“Аўтобус дрогкі...” ............................................................. 17
“Аблокі цёплыя плылі...” ................................................... 18
“Калі нараджаецца песня...” .............................................. 19
“Ты кажаш, бору не баліць...” .......................................... 19
“Мы – пракокі ў сваёй Айчыне...” .................................... 19
“Вятры зямныя...” .............................................................. 20

Рэпазіторый ВДУ

На Івана Купалу .............................................................................. 20
“Я слухаю Коласа...” ........................................................................ 21
“Зямля любімая, з табою...” ............................................................ 21
Зямная сімфонія ............................................................................... 22
Хрыстос прызямліўся ў Гародні ...................................................... 23
“Загляне сонца і ў наша ваконца…” ................................................ 23
Выток ................................................................................................. 24
Беларуская Мадонна ........................................................................ 24
“Гасцінна да сябе паклікала...” ........................................................ 25
“Яшчэ далёка наш прывал...” .......................................................... 26
“Журботная ўсмешка Быкава...” ..................................................... 26
“Блакітны вецер...” ........................................................................... 27
Ідзе па Віцебску паэт ....................................................................... 27
“Я з табой, несмяротны народзе!..” ................................................ 28
Памяці Петруся Броўкі ..................................................................... 28
“Радзіма белая буслоў...” ................................................................. 29
Такі ўжо лёс ...................................................................................... 29
“Я да крынічкі чыстае прынік...” ..................................................... 29
“Уваходжу ў лес...” ........................................................................... 30
“Мне так патрэбна слова...” ............................................................. 30
“Планета стомлена гудзе...” ............................................................. 30
“Я ў любові Табе не клянуся...” ...................................................... 30
“Раскрыльце песню, музыку раскрыльце...” .................................. 31
“Мне трэба...” ................................................................................... 31

**ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА** ............................................................ 32
“Яшчэ адна восень...” ....................................................................... 32
Вера ................................................................................................... 33
“Няспынны час...” ............................................................................. 33
Пра сучаснасць ................................................................................. 34
“Там, дзе роздум вечаровы...” ......................................................... 34
Пра казкі ............................................................................................ 34
“Трымаю яблык...” ............................................................................ 35
“Трывожце, дарогі і добрыя сны...” ................................................ 35
“Часамі сумняваюся...” ..................................................................... 36
“Людзі – не эталоны...” .................................................................... 36
“Гляджу на глобус...” ....................................................................... 37
“Смяецца чалавек, смяецца...” ......................................................... 38
“Бывае так: разыйдуцца шляхі...” ................................................... 38
“Задумваюся ўсё часцей...” .............................................................. 38
“Я кожны дзень сябе знаходжу...” .................................................. 39
“Мой ранак...” ................................................................................... 39
“Не кідайце на Чалавека цень...” .................................................... 40



Репозиторий ВГУ

“У чалавека крылы – як у птушкі...” ............................................ 40
Роздум ..................................................................................... 40
“Хоць сэрца не змяшчае боль...” ................................................ 41
“Бывае – чую галасы...” ............................................................ 41
“Разбудзілі мяне...” .................................................................. 42
“І толькі сталасць...” ................................................................. 42
“Я ў слове адчуваю цішыню...” ................................................. 43
“Не трэба Чалавеку адзінота...” ................................................. 43
“Заўсёды веру шчырасці...” ....................................................... 43
“Адыходзяць сябры, адыходзяць...” .......................................... 44
Памяці сябра ............................................................................. 44
“Ва ўсім паэзія...” ...................................................................... 45
“Ці ява, а ці летуценне...” .......................................................... 45
“Мой свет адкрыты шчасцю...” ................................................. 45
“Чалавек нараджаецца жыць...” ................................................ 46
“А лісце кружыцца...” ............................................................... 46
“Не хавайце сваіх усмешак...” ................................................... 46

**ПЕЙЗАЖНАЯ ЛІРЫКА** ............................................................ 47
“Закалыхаўся бор стары...” ....................................................... 47
“Далёка адплылі дажджы...” ..................................................... 47
“А навошта верыць цішыні...” ................................................... 48
Дажджы ..................................................................................... 48
“Што ты шэпчаш, задумленны бор...” ....................................... 48
Вераснёвы снег ......................................................................... 49
Трыпціх ..................................................................................... 49
Лістапад .................................................................................... 50
Першы снежань ......................................................................... 51
“Грукне галінкай...” .................................................................. 51
“Дзень добры, лес...” ................................................................. 52
“Світанне...” .............................................................................. 52
“Голлем гнуткім вятры зашасталі...” ......................................... 53
“Чуеце гукі золкавай раніцы...” ................................................. 53

**ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА** .............................................................. 54
“А вось і плытная завея...” ........................................................ 54
“Мне ўсё чагосьці нестае...” ...................................................... 54
“Ля сосен кашлатых...” ............................................................. 54
Зорка Святлана ......................................................................... 55
“Перад табою трымаю споведзь...” ............................................ 55
Чаканне ..................................................................................... 56
“Ад цябе я чакаю лістоў...” ....................................................... 56
“Без цябе і радасць для мяне не радасць...” ............................... 57

Репозиторий ВГУ

"Маёй любові снежны зарапад..." .......... 57
"Завея круціць..." .......... 58
"Галёкае рэха спакусліва..." .......... 58
"Ці вечарам зорным..." .......... 58
"Ты – як песенька, ты – як сонейка..." .......... 59
"Ты толькі пакліч..." .......... 59
"Любімая, не трэба сумаваць..." .......... 60
"Ты – мой прамень..." .......... 61
"Самыя добрыя песні..." .......... 61
Вераскі .......... 61
"Зусім цябе не дакараю..." .......... 62
"Жыве Паэзія ў душы..." .......... 62

**ПЕРАКЛАДЫ** .......... 63
Пясняр .......... 63
Бульба .......... 63
"Ці многа мне трэба – акраец хлеба..." .......... 64
"Красуе жыта..." .......... 65
Майму роднаму месцу .......... 65
"Духі нябесные – воблачкі вечныя..." .......... 66
"Лятуць маі думкі ў край..." .......... 67
"У падарожжы час вясёлы..." .......... 67
У альбом пані К...скай .......... 68

Репозиторий ВГУ

Репозиторий ВГУ